Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 СНЕЖНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 231 (27841) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Новы рулявы футбольнай зборнай**

СТАР. 3



**Як гучыць жаночая душа?**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Віктар НАЗАРАНКА, старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі:**

*«Якасць нашай прадукцыі сёння высокая. Беларускія прадпрыемствы выпускаюць шырокую наменклатуру тавараў з выдатнымі спажывецкімі характарыстыкамі. Мне здаецца, што ў той сітуацыі, якая склалася, тут часам выкарыстоўваецца інструмент нездаровай канкурэнцыі, калі пачынаюць гаварыць, што прадукцыя шкодная. Дзяржстандарт досыць высока ацэньвае сістэму кантролю Беларусі за паказчыкамі бяспекі. І прадпрыемствы, якія адступілі ад патрабаванняў бяспекі, знаходзяцца на строгім кантролі адпаведных службаў, у тым ліку і службаў Дзяржстандарту. Таму для вырашэння спрэчных сітуацый трэба выкарыстоўваць пляцоўку Еўразійскай эканамічнай камісіі. Практычна па любым пытанні ёсць патрэбныя дэпартаменты і спецыялісты, якія ў стане кампетэнтна разабрацца».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.12.2014 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 10830,00 ▲ |
| Еўра | 13320,00 ▼ |
| Рас. руб. | 205,00 ▲ |
| Укр. грыўня | 719,72 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Музыка душы

Звычайна гаворачы «арганіст», мы маем на ўвазе менавіта мужчыну, бо складаны духавы інструмент патрабуе не толькі ўмення, але і фізічнай сілы. Ганна Малькевіч, хутчэй, выключэнне з правілаў. Яна 30 гадоў працуе загадчыцай філіяла Вілейскай дзіцячай школы мастацтваў у вёсцы Далгінава, а 20 з іх іграе на аргане ў вясковым парафіяльным касцёле. У гэтыя дні Ганна Мечыславаўна рыхтуецца да калядных свят, каб у дні Божага Нараджэння яе арган гучаў асабліва ўрачыста.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Надвор'е

## ГАЛАЛЁД І ТУМАН

На наступным тыдні пацяплее, аднак мокры снег нам будзе не даспадобы...

**У пятніцу тэрыторыя нашай краіны зноў трапіць пад уплыў зоны павышанага ціску, якая была сфарміравана ў вільготнай паветранай масе, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму ў асобных раёнах пройдзе невялікі снег, месцамі чакаецца слабы туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень ад 0 да мінус 5 градусаў. Ужо ў суботу і нядзелю на тэрыторыю пачнуць распаўсюджвацца вільготныя паветраныя масы з боку паўднёвага ўсходу Еўропы. Таму ў суботу месцамі, а ў нядзелю ўжо паўсюдна пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег. У асобных раёнах чакаецца туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы ў выхадныя будзе ад 2 да 9 марозу, а ў ноч на суботу пры праясненнях да мінус 12 градусаў. Удзень плануецца ад мінус 5 да плюс 1 градуса.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня характар надвор'я істотна не зменіцца. Месцамі будзе ісці невялікі снег і мокры снег. У асобных раёнах чакаецца туман і слабы



галалёд. На дарогах — галалёдзіца. З панядзелка і да серады тэмпература паветра ўначы будзе ў межах 1-8 марозу, удзень — ад мінус 4 да плюс 1 градуса. Менавіта такое няўстойлівае надвор'е і тэмпературны фон адпавядае кліматычнай норме першай дэкады снежня.

**Сяргей КУРКАЧ**

Прамая лінія

## ХВАРОБА — НЕ ПРЫСУД

Самыя розныя пытанні, звязаныя з прафілактыкай і лячэннем дабраякасных і злаякасных пухлін, а таксама з арганізацыяй анкалагічнай дапамогі, можна будзе задаць падчас «прамой лініі» **галоўнаму ўрачу Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера Уладзіміру Сцяпанавічу КАРАНІКУ**.

«Прамая лінія» адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» **12 снежня, у пятніцу, з 12.00 да 13.00** па нумары **287 18 71**. Папярэднія пытанні можна пакінуць, пазваніўшы на нумар **287 18 29**.